чыкаў патроху пачынаюць «здымаць» напластаванні XX стагоддзя са старажытных сімвалаў і вяртаць ім першапачатковы сэнс.

Такім чынам, на прыкладзе бытавання пяціканцовай зоркі як сімвала Чырвонай Арміі савецкіх часоў, можна прыйсці да высновы, што асноўныя сімвалы любой ідэалогіі маюць карані ў агульнасусветнай традыцыі. І, хаця пры іх укараненні ствараюцца новыя «традыцыі» і фарміруюцца новыя семантычныя ядры, з цягам часу сімвалам вяртаюць іх першапачатковы сэнс, прапушчаны праз навукова-культурную парадыгму сучаснасці.

1. *Бауэр, В.* Энциклопедия символов / В. Бауэр, И. Дюмотц, С. Головин ; пер. с нем. Г. Гаева. – М. : КРОН-ПРЕСС, 1998. – 512 с.

2. *Бидерман, Г.* Энциклопедия символов / Г. Бидерман ; пер. с нем. В. М. Валькова. – М. : Республика, 1996. – 334 с.

3. *Грейг, О.* От НКВД до Аненэрбе: магия печатей Звезды и Свастики / О. Грейг. – М. : Эксмо: Алгоритм, 2010. – 304 с.

4. *Комлік-Ямаціна, Н. А.* Сімволіка грашовых знакаў Беларусі / Н. А. Комлік-Ямаціна // Современные интеграционные процессы и Республика Беларусь: европейский и евразийский контекст: материалы 6-й Междунар. науч.-практич. конф. / ГрГУ им. Я. Купалы ; редкол.: В. Н. Ватыль [и др.]. – Гродно : ГрГУ, 2014. – С. 290–293.

5. Советская военная энциклопедия в 8 томах ; ред. совет В. Е. Ворошилов, А. А. Бубнов [и др.]. – М. : «Сов. энциклопедия», 1977. – Т. 4 : К–Л. – 654 с.

6. *Степанов, А.* Мифы и действительность / А. Степанов // «Старый ЦЕЙХГАУЗ», Российский военно-исторический журнал, М., № 2/2010 (34) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://historymania.info/view_post.php?id=139. – Дата доступа: 21.02.2015.

7. *Hobsbaum, E.* The Invention of Tradition, Cambridge, 1983.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫКІ БЕЛАРУСІ

***Д. А. Крывашэй,***
*дацэнт кафедры філасофіі,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт;*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

Паспрабуем акрэсліць некаторыя пытанні сучаснай дзяржаўнай культурнай палітыкі, вырашаць якія неабходна зыходзячы з нацыянальных інтарэсаў і пагроз, вызначаных Канцэпцыяй

нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 9 лістапада 2010 г. № 575).

1. Развіццё грамадзянскай супольнасці з улікам нацыянальных інтарэсаў і асаблівасцей уваходзіць у лік нацыянальных інтарэсаў нашай краіны. На практыцы дэклараванае дзяржаўна-грамадскае партнёрства ў сферы культуры рэалізоўваецца слаба. Недастатковы ўзровень развіцця грамадзянскай супольнасці з'яўляецца ўнутранай крыніцай пагрозы нацыянальнай бяспекі Беларусі. Шмат якія праблемы, што існуюць у культурным і сацыяльным жыцці грамадства, могуць быць вырашаны непасрэдна самімі грамадзянамі праз грамадскія ініцыятывы. Актыўнасцю вызначаліся грамадскія арганізацыі ў такіх прыярытэтных напрамках рэалізацыі культурнай палітыкі, як ахова спадчыны, мовы, народнай творчасці; стварэнне і папулярызацыя твораў мастацтва і літаратуры. Добрым прыкладам з'яўляецца дзейнасць Грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. *Палітыкам неабходна заахвочваць і падтрымліваць удзел грамадзян у распрацоўцы і рэалізацыі культурнай палітыкі як на агульнадзяржаўным, так і на мясцовым узроўнях. Неабходна надаць рэгулярнасць працы Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, стварыць арганізацыйныя схемы і мадэлі сувязей паміж структурамі дзяржаўнага кіравання, установамі культуры, творчымі аб'яднаннямі і іншымі грамадскімі арганізацыямі.*

2. У краіне існуюць адзінкавыя праграмы і праекты, накіраваныя на забеспячэнне культурных запытаў асяродкаў з абмежаваным доступам да культуры: эмігрантаў, бежанцаў, маламаёмасных, інвалідаў, беспрацоўных, хворых, вязняў і г. д. Напрыклад, у распрацоўцы Дзяржаўнай праграмы па папярэджанні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў на 2006–2010 гг. удзел узялі Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства адукацыі, грамадскія аб'яднанні інвалідаў. На жаль, у сістэму мерапрыемстваў не ўвайшлі культурныя акцыі і распрацоўкі шляхоў інтэграцыі інвалідаў у грамадства праз культуру. Дасягненню грамадскай еднасці жыхароў, барацьбе з сацыяльнай ізаляванасцю можа спрыяць *распрацоўка нацыянальнай стратэгіі, у якой культурныя ўстановы будуць разглядацца як інструменты, што дапамогуць супрацьстаяць негатыўным*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*з'явам у грамадстве і пазбегнуць сацыяльнай ізаляванасці. Неабходна данесці да грамадства, сумесна з грамадскімі арганізацыямі стварыць сістэму работы па рэабілітацыі інвалідаў праз творчасць і мастацтва.*

3. За два дзесяцігоддзі ўсе асноўныя галіны культурнай сферы атрымалі заканадаўчае забеспячэнне. Праз заканадаўчыя і нарматыўныя акты дзяржава паступова змяняла «ўмовы гульні» ў сферы культуры. Адбылася трансфармацыя ліберальнай мадэлі ў бок сацыял-дэмакратычнай з наданнем разнастайных прэферэнцый дзяржаўнаму сектару (падатковыя льготы, зніжэнне арэнднай платы і да т. п.). Цяпер завяршаецца праца над Кодэксам аб культуры. Аднак шмат якія палажэнні законаў носяць дэкларатыўны характар, асобныя іх палажэнні не рэалізаваны. *Адсутнасць заканадаўства аб дабрачыннасці і спонсарстве* не дазваляе атрымаць шырокае развіццё гэтай дзейнасці ў культуры. Фактычна *не выконваюцца палажэнні артыкула 13 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь*, якім гарантаваліся роўныя правы для ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці, роўныя ўмовы для развіцця ўсіх формаў уласнасці. Гэта не спрыяе развіццю прыватнага сектара сферы культуры, механізмаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

4. У сённяшні час назіраецца жахлівае змяншэнне колькасці ўстаноў культуры. За перыяд 1991–2015 гг. не было такога істотнага адрознення ва ўзроўні заработнай платы ў сферы культуры ў параўнанні з сярэднім заробкам па краіне. Гэта прыводзіць да абвастрэння такіх пагроз нацыянальнай бяспекі, як зніжэнне ўзроўню дабрабыту і якасці жыцця насельніцтва, узнікненне значных адрозненняў у якасці жыцця гарадскога і сельскага насельніцтва, жыхароў вялікіх, сярэдніх і малых гарадоў, і не адпавядае нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь у сацыяльнай сферы («забеспячэнне занятасці працаздольных грамадзян і дастойнага ўзроўню аплаты працы»; «мінімізацыя негатыўных наступстваў сацыяльнай дыферэнцыяцыі і сацыяльнага напружання ў грамадстве»; «задавальненне асноўных сацыяльных патрэб грамадзян» у частцы культурных патрэб). Існаванне ўстаноў культуры наўпрост звязана з неабходнасцю супрацьстаяць працэсам дэгуманізацыі грамадства. Калі «ўсплёск» чалавечых эмоцый будзе здзяйсняцца праз творчы пачатак шляхам непасрэднага ўдзелу як у прафесійнай культурнай дзейнасці, так і ў аматарскім мастац-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тве, гэта дазволіць адмежаваць людзей ад найніжэйшых праяў чалавечай натуры, а значыць, знізіць узровень агрэсіі ў грамадстве, супрацьстаяць розным праявам асацыяльных паводзін, распаўсюджанню алкагалізму і наркаманіі.

5. Новыя механізмы гаспадарання, абмежаванасць бюджэтнага фінансавання стымулявалі развіццё платных паслуг, пошук пазабюджэтных сродкаў. *Неабходна адмовіцца ад практыкі павышэння тэмпу росту платных паслуг.* Гэта прыводзіць да камерцыялізацыі культуры, ставіць пад пагрозу выкананне асноўных задач, пастаўленых перад галіной: ажыццяўленне дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры, якая забяспечвае рэалізацыю правоў грамадзян Рэспублікі Беларусь на свабоду мастацкай творчасці, удзел у культурным жыцці і карыстанне дасягненнямі культуры, доступ да культурных каштоўнасцей, развіццё супрацоўніцтва з замежнымі краінамі ў сферы культуры.

Падобны стан рэчаў з'яўляецца пагрозай для такога нацыянальнага інтарэсу нашай дзяржавы, як развіццё інтэлектуальнага і духоўна-маральнага патэнцыялу грамадства, захаванне і прымнажэнне яго культурнай спадчыны, умацаванне духу патрыятызму, ставіць пад пытанне дэкларованую высокую сацыяльную адказнасць дзяржавы. У краіне не сфарміравалася ўяўленне аб культуры як істотным механізме сацыяльнага развіцця.

6. *Бачыцца неабходным стварэнне сістэмы маніторынгу выканання дзяржаўных праграм у сферы культуры, узнікненне дыскусійнай навуковай пляцоўкі для аналізу тэндэнцый развіцця сферы культуры і выпрацоўкі рэкамендацый на будучыню.* Значнай перашкодай для грунтоўнага аналізу з'яўляецца змена збору і апрацоўкі статыстычнай інфармацыі. Так, у адпаведнасці з Агульнадзяржаўным класіфікатарам відаў эканамічнай дзейнасці, паслугі ўстаноў культуры апынуліся ў раздзеле «Прадастаўленне камунальных, сацыяльных і персанальных паслуг» і аб'яднаны ў напрамак «Дзейнасць па арганізацыі адпачынку і забаў, культуры і спорту», у той час як паслугі адукацыі выдзелены ў асобны раздзел. Дзіўным чынам дзейнасць цыркаў, лялечных тэатраў аб'яднана ў адзін эканамічны напрамак з забаўляльнымі цірамі.

Грамадства ў цэлым выйграе ад павышэння ўзроўню адукаванасці яго членаў, у тым ліку за кошт павышэння культурнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзроўню насельніцтва. У канчатковым выніку гэта выражаецца ва ўдасканаленні чалавечага патэнцыялу, павышэнні якасці сацыяльнага асяроддзя, што не можа не сказацца і на эканамічным развіцці. *Неабходны новы погляд на дзяржаву як носьбіта доўгатэрміновых інтарэсаў грамадства,* пры якім дзяржаўная падтрымка культуры і мастацтва будзе расцэньвацца не з пазіцый абцяжарвання дзяржаўнага бюджэту, а як інвестыцыі ў чалавечы капітал, укладанні ў будучыню краіны.

7. *Неабходна памятаць аб тым, што нацыянальная культура аказвае значны ўплыў на фундаментальныя асновы дзяржавы, на ідэалагічныя, палітычныя, сацыяльна-эканамічныя аспекты існавання і ўстойлівага развіцця чалавецтва, грамадства, з'яўляецца адным з яе стратэгічных рэсурсаў.* Менавіта культура выступае галоўным гарантам нацыянальнай ідэнтычнасці, з'яўляецца асноўным прынцыпам нацыянальнага суверэнітэту і нацыянальнага гонару, які не дае растварыцца нацыі ў агульным патоку глабалізацыі.

Вядучыя краіны праз знешнюю культурную палітыку пашыраюць свае палітычныя ўплывы, аказваюць непасрэднае ўздзеянне на палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя працэсы, ствараючы пагрозу нацыянальным інтарэсам, разбураючы духоўна-маральныя каштоўнасці і нацыянальную тоеснасць грамадзян, страту імі роднай мовы. Страта значнай часткай грамадзян традыцыйных маральных каштоўнасцей і арыенціраў, спробы разбурыць нацыянальныя духоўна-маральныя традыцыі аднесена да адной з пагроз нацыянальнай бяспекі Беларусі (Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь).

Экспарт, распаўсюджанне і папулярызацыя нацыянальнай культуры сталі дзейснымі інструментамі дыпламатыі і дастаткова эфектыўным сродкам барацьбы за нацыянальныя інтарэсы той ці іншай дзяржавы. Напрыклад, культура з'яўляецца першым «стаўпом» распрацаванай ў 2004 г. і рэалізуемай пад час прэзідэнцтва Буша-малодшага канцэпцыі «мяккай сілы» («soft power»). У ліпені 2012 г. Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі У. Пуцін акцэнтаваў увагу паслоў і пастаянных прадстаўнікоў Расіі на неабходнасці выкарыстання метадаў «мяккай сілы» ў паўсядзённай працы дыпламатычнага корпуса.

8. Бачацца неабходнымі пашырэнне праграмы культурнага абмену, стварэнне ўласных стыпендыяльных праграм для дзеячаў культуры. Напрыклад, у Польшчы ёсць праграма «Gaude

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Polonia». Значную карысць могуць прынесці летнія школы для замежных студэнтаў па вывучэнні беларускай мовы, гісторыі і культуры. Значную частку працы па рэалізацыі падобных праектаў маглі бы ўзяць на сябе недзяржаўныя арганізацыі пад патранажам дзяржавы. Напрыклад, грамадскія структуры з удзелам навукоўцаў распрацавалі міжнародны стандарт сертыфікату аб валоданні беларускай мовай як замежнай.

*Неабходны цэнтр каардынацыі знешняй культурнай палітыкі.* На жаль, створаны Інстытут культуры Беларусі па шмат якіх прычынах не ў стане рэалізаваць гэтую задачу.

## ФИЛЬМ «ТАХИР И ЗУХРА» В КОНТЕКСТЕ ЕГО ПРОИЗВОДСТВА В ПЕРИОД ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

***М. М. Кучкаров,***
*научный сотрудник;*
*Национальный университет*
*Узбекистана им. Мирзо Улугбека*

Фильм «Тахир и Зухра» был снят на Ташкентской киностудии в годы войны и вышел на экраны в 1945 г. Его без сомнения можно отнести к шедеврам мирового кино. Чтобы понять ценность фильма не только как произведения искусства, но и как продукта киноиндустрии, необходимо рассматривать его в контексте времени производства и проката.

В годы Великой Отечественной войны узбекский народ участвовал в борьбе с фашистским нашествием. Представители национальной культуры внесли свой вклад в создание произведений, укрепляющих дух и самосознание всего советского народа.

Узбекистан с первых дней войны принял более сотни промышленных предприятий. Кроме того, решением правительства были эвакуированы в глубокий тыл и киностудии, т. к. с обострением военных действий в основных центрах советской киноиндустрии осуществление съемок стало невозможным. В Ташкент и Самарканд были эвакуированы Одесская киностудия, часть «Мосфильма», «Ленфильма», в Сталинабаде (нынешний Душанбе), кроме копировальной фабрики, размещались Минская киностудия и «Союздетфильм», а в Ашхаба-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ